PolotskSU



**УДК 72.031(476)**

# ГІСТОРЫЯ ВЫВУЧЭННЯ НАРОДНАГА ДОЙЛІДСТВА БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ[1]

***канд. гіст. навук, дац. У.Я. АЎСЕЙЧЫК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разгледжана гісторыя вывучэння народнага дойлідства Беларускага Падзвіння. Вылучаны этапы ў даследаванні гэтай праблематыкі, ахарактарызаваны працы, раскрыта значэнне даследаванняў і іх уклад у вывучэнне традыцыйнага народнага дойлідства рэгіёна. У артыкуле прааналізаваны працы, якія былі апублікаваныя з XVI ст. і да нашага часу. Нягледзячы на тое, што першае даследаванне з'явілася яшчэ ў канцы XVI ст., але сістэматычнае вывучэнне народнай архітэктуры Падзвіння пачалося толькі ў XIX ст. Таму асноўная ўвага ў рабоце звернута на даследаванні XIX – пачатку XXI ст.*

***Ключавыя словы:*** *гістарыяграфія, Беларускае Падзвінне, архітэктура, традыцыйная культура, беларускі этнас.*

Гісторыя вывучэння народнага дойлідства Паўночнай Беларусі мае даўнюю традыцыю. Аднак фактычна да пачатку XIX ст. мэтанакіраванага вывучэння народнай культуры Беларусі, як, уласна і рэгіёна, не вялося. Працы, у якіх апісана традыцыйная матэрыяльная культура мясцовага насельніцтва, з'яўляюцца хутчэй выключэннем.

Пачынаючы з XVI ст. з'яўляюцца першыя працы краязнаўча-этнаграфічнага характару, якія ўтрымліваюць звесткі пра драўляную архітэктуру насельніцтва Беларусі. Немалаважнае значэнне ў вывучэнні народнай культуры рэгіёна ў гэты перыяд мелі замежныя падарожнікі, паслы, вайскоўцы, якія наведвалі беларускія землі. Асаблівае значэнне маюць звесткі тых іншаземцаў, якія працяглы час пражывалі на беларускай зямлі.

Фактычна першым, хто пакінуў звесткі па народнай архітэктуры краю, быў лютэранскі пастар, немец па паходжанні Паўль Одэрборн (каля 1555-1604 гг.). Падчас Лівонскай вайны, з'яўляючыся капеланам, ён пэўны час знаходзіўся на Падзвінні. Тут П. Одэрборн і зрабіў апісанне побыту мясцовага насельніцтва. Яно было закончана ў 1581 г. і выканана ў выглядзе ліста да лютэранскага тэолага Давыда Хітрэўса. У 1582 г. праца была апублікавана асобным творам на лацінскай мове пад назвай «Праўдзівы і грунтоўны аповед пра веру русаў, [іх] шлюбныя і пахавальныя абрады, побыт, адзенне і г.д., а таксама пра веру і звычаі татараў» («De Russorum religione, ritibus nuptiarum, funerum, victu, vestitu, &c. et de Tartarorum religione ac moribu») [1]. Праца таксама ўвайшла асобнай часткай у зборнік вядомага вучонага XVI у. Яна Ласіцкага і доўгі час разглядалася як назіранні апошняга, зробленыя ў раёне Заслаўля. У сучасным беларускім нарадазнаўстве матэрыялы з працы П. Одэрборна яшчэ пазіцыянуюцца як уласна запісы Я. Ласіцкага. Матэрыялы П. Одэрборна адносяцца да Полацка-Дзісненскага Падзвіння. Праца ўтрымлівае кароткую характарыстыку жылля і драўляных храмаў мясцовага насельніцтва [1].

З канца XVIII ст. прыкметна ўзрастае цікавасць да народнай культуры насельніцтва Падзвіння. Гэта цікавасць з боку мясцовай інтэлігенцыі была абумоўлена ўплывам Рамантызму – ідэйна-мастацкага кірунку, які прыйшоў на змену эпохі Асветніцтва. Для гэтага часу характэрна з'яўленне спецыяльных прац, прысвечаных розным бакам беларускай традыцыйнай культуры. Беларускаму Падзвінню прысвяціў сваю працу «Лісты пра Беларусь» («Listy o Bialorusi») [2] Рамуальд Падбярэскі. У артыкуле, надрукаваным у некалькіх нумарах часопіса «Tygodnik Petersburski» у 1844 г., акрамя апісанняў гаспадарчых заняткаў, музычнай культуры і характарыстыкі этнічнага складу насельніцтва Віцебскай губерні ўтрымліваецца апісанне народнага дойлідства краю.

Новы і значны імпульс у актывізацыі даследавання народнай культуры Беларусі быў выкліканы заснаваннем у 1845 г. у Санкт-Пецярбургу Рускага геаграфічнага таварыства (РГТ). У РГТ была распрацавана праграма па зборы і фіксацыі этнаграфічных матэрыялаў, разасланая ў 1847 г. па краіне. У адказ на гэту праграму сталі прыходзіць матэрыялы з рэгіёнаў, у тым ліку і з беларускіх губерняў. Некаторыя з гэтых матэрыялаў былі надрукаваны ў «Этнаграфічным зборніку». Так, у другім яго выпуску выйшла праца «Побыт беларускіх сялян» (1854) [3], прысвечаная беларусам Падзвіння. У яе ўвайшлі матэрыялы, адпраўленыя ў рэдакцыю часопіса ў 1848-1850 гг. з Віцебскай губерні рознымі карэспандэнтамі. Аснову працы склалі матэрыялы Мікалая Анімеле. У артыкуле прадстаўлена апісанне жылля, хатняга начыння, гаспадарчых пабудоў. У трэцім выпуску «Этнаграфічнага зборніка» (1858) была апублікавана праца Адама Кіркора "Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню" [4]. Праца

[1] Артыкул падрыхтаваны ў ходзе працы па праекце БРФФД: "Семантыка традыцыйнага культурнага ландшафту Беларускага Падзвіння: эвалюцыя і трансфармацыя ў XX – пачатку XXI ст." (№ Г18-078 ад 30.05.2018).

PolotskSU



ўтрымлівае звесткі і па народнай архітэктуры Заходняга Падзвіння. А. Кіркор апісаў паселішчы, жыллё і гаспадарчыя пабудовы.

Пэўнае значэнне ў даследаванні традыцыйнай культуры беларусаў сярэдзіны XIX ст. мела падрыхтоўка гістарычна-геаграфічных выданняў. З ліку такіх прац вылучаецца кніга М.В. Без-Карніловіча «Гістарычныя звесткі пра знамянальныя месцы на Беларусі з дадаткам іншых звестак, якія адносяцца да яе ж» (1855) [5]. У гэтым выданні, акрамя гістарычных і статыстычных матэрыялаў, змешчана кароткая характарыстыка паселішчаў і апісанне жылля беларускага насельніцтва Віцебскай і Магілёўскай губерняў.

Шэраг матэрыялаў па народнай культуры рэгіёна быў апублікаваны і ў неспецыялізаваных перыядычных выданнях сярэдзіны XIX ст. Так, у 1854 г. у «Маскоўскіх губернскіх ведамасцях» была надрукавана праца А. Васкоўскага «Беларусь (Этнаграфічны нарыс)». Пад «Беларуссю» аўтар разумеў тэрыторыю Віцебскай і Магілёўскай губерняў. У працы каратка характарызуецца жыллё насельніцтва губерняў. У 1855 г. у выданні «Gazeta Rolnicza» апублікавана праца А. Місуны «Лісты з-пад Лепельска (губ. Віцебская)» («Listy z pod Lepelska (gub. Witebska)»). У ёй змешчана інфармацыя пра планіроўку мясцовых паселішчаў і сялянскага жылля.

Новы этап у даследаванні народнай культуры беларусаў прыпадае на 1860-1870-я гг. Значную ролю ў этнаграфічным вывучэнні рэгіёна ў гэты перыяд адыграла адкрыццё ў 1867 г. у Вільні Паўночна-заходняга аддзялення Рускага Геаграфічнага таварыства. У гэты час быў апублікаваны шэраг даследаванняў, дзе разглядаліся пытанні традыцыйнай народнай архітэктуры беларускага насельніцтва. З 1860-х гг. у Віцебскай губерні разгарнуў сваю навуковую дзейнасць вядомы беларускі гісторык, археолаг і этнограф А.М. Семянтоўскі. Асноўнай яго працай па побыце і культуры мясцовага насельніцтва стаў «Этнаграфічны агляд Віцебскай губерні» (1872) [6]. А.М. Семянтоўскі апісаў асаблівасці паселішчаў беларускага насельніцтва губерні, даў характарыстыку жыллю.

Плённымі ў даследаванні народнай культуры беларусаў былі апошнія два дзесяцігоддзі XIX і пачатак XX ст. У гэты час была апублікавана ў трох тамах праца П.В. Шэйна «Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-заходняга краю» (1887-1902 гг.) [7]. У трэці том, які быў выдадзены ўжо пасля смерці П.В. Шэйна, увайшлі звесткі пра побыт мясцовага насельніцтва, у тым ліку і пра жыллё.

Важнай асобай у вывучэнні народнай культуры краю канца XIX ст. з’яўляецца Мікалай Якаўлевіч Нікіфароўскі. Асаблівай увагі заслугоўвае праца М.Я. Нікіфароўскага па матэрыяльнай культуры рэгіёна «Нарысы прастанароднага жыцця-быцця ў Віцебскай Беларусі і апісанне прадметаў паўсядзённасці» (1895) [8]. Праца складаецца з 4 частак. Трэцяя частка прысвечана вывучэнню жылля і гаспадарчых пабудоў беларусаў Віцебшчыны. У ёй падрабязна разгледжана планіроўка населеных пунктаў, ахарактарызаваны жылыя і гаспадарчыя пабудовы. Праца змяшчае даволі падрабязныя апісанні этапаў будаўніцтва і будаўнічай тэхнікі. У ёй грунтоўна прааналізавана ўнутраняя планіроўка жылля, асаблівасці інтэр’еру і мэблі. Каштоўнсць уяўляюць прыведзеныя ў працы планы жылля і сяліб.

Для канца XIX – пачатку XX ст. характэрна таксама выданне абагульняючых гістарычна-геаграфічных і гістарычна-статыстычных зборнікаў, якія прысвечаны асобным рэгіёнам. У 1905 г. быў апублікаваны IX том выдання «Расія. Поўнае геаграфічнае апісанне нашай Айчыны» [9], у якім утрымліваюцца матэрыялы, сабраныя на тэрыторыі Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай і Смаленскай губерняў. Гістарычна-этнаграфічныя часткі кнігі былі напісаны М.В. Доўнар-Запольскім і Д.З. Шэндрыкам. У працы змешчана характарыстыка народнай архітэктуры, апісаны сельскія паселішчы, сядзібная забудова, гаспадарчыя пабудовы, жыллё і яго ўнутраная плаіроўка. З ліку абагульняючых прац пачатку XX ст. вылучаецца кніга К.Т. Анікіевіча «Сенненскі павет Магілёўскай губерні» (1907) [10]. У працы таксама каратка апісана жыллё мясцовага насельніцтва.

Важнае месца ў вывучэнні народнага драўлянага дойлідства Беларусі займае праца А.М. Харузіна “Славянскае жыллё ў Паўночна-Заходнім краі” (1907) [11]. Аднак праца носіць пераважна абагульняючы характар. Матэрыялы з Паўночнай Беларусі ў ёй слаба разгледжаны.

У 1920-я гг. на хвалі нацыянальнага адраджэння значна ўзрастае цікавасць да гістарычнай і духоўна-культурнай спадчыны беларусаў. З'яўляюцца і першыя працы на беларускай мове, прысвечаныя побыту і традыцыям карэннага насельніцтва. У гэты час шырокі размах атрымлівае краязнаўчы рух. У краязнаўчых выданнях таго перыяду апублікаваны значны аб'ём даследаванняў па народнай культуры беларусаў. Так, у 1927 г. быў апублікаваны невялікі артыкул М. Касяровіча “Асноўныя моманты беларускага дойлідства” [12].

Грамадска-палітычныя асаблівасці развіцця Беларусі ў 1930-х, рэпрэсіі гэтага перыяду, падзеі Другой сусветнай вайны фактычна цалкам спынілі вывучэнне народнай культуры Беларусі ў 1930-1940-я гг. Толькі з сярэдзіны 1950-х гг. сітуацыя змяняецца. Штуршком да актывізацыі вывучэння народнай культуры беларусаў стала стварэнне ў 1957 г. Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Інстытут доўгі час з'яўляўся фактычна адзіным цэнтрам па вывучэнні народнай культуры і побыту

PolotskSU



беларускага насельніцтва. Яго супрацоўнікамі былі праведзены мноства этнаграфічных экспедыцый на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і на Падзвінне. Першая этнаграфічная экспедыцыя, якая закранула рэгіён, была праведзена ў 1954 г. (арганізавана тады яшчэ сектарам этнаграфіі Інстытута гісторыі НАН БССР). Экспедыцыя праходзіла ў паўночна-заходніх раёнах Падзвіння.

У паваенным беларускім народазнаўстве прыярытэтнае месца займае вывучэнне матэрыяльнай культуры. А таму праблематыка народнай архітэктуры таксама была актуальнай. Гэтай праблеме былі прысвечаны публікацыі Л.А. Малчанавай і У.С. Гуркова, шэраг калектыўных прац.

Даследванне народнага дойлідства беларусаў Л.А. Малчанава ажыццяўляе з 1950-х гг. У пасляваеннай этнаграфічнай і архітэктурнай навуцы яна адной з першых звярнулася да гэтай праблематыкі. Яна апублікавала шэраг даследаванняў па традыцыйнай архітэктуры беларусаў. Пытанням спецыфічных рысаў беларускай традыцыйнай забудовы даследчыца прысвяціла артыкул “З гісторыі развіцця сельскіх пасяленняў і сядзіб беларусаў” (1956) [13]. У гэтым жа годзе была апублікавана і іншая праца Л.А. Малчанавай па беларускім народным дойлідстве “Беларускае сялянскае жыллё феадальнай эпохі” (1956). У ходзе працы па вывучэнні народнага дойліства Л.А. Малчанавай быў падрыхтаваны альбом “Беларуская народная архітэктурная разьба” (1958) [19]. Характарыстыцы сельскіх пасяленняў, сядзібаў і жылля быў прысвечаны асобны раздзел у працы Л.А. Малчанавай «Матэрыяльная культура беларусаў» (1968) [14]. У ім асноўная ўвага ўдзелена характарыстыцы сядзібнай забудовы беларусаў XIX – першай паловы XX ст.

З 1960-х гг. пытанні народнага дойлідства беларусаў даследуе У.С. Гуркоў. У працах даследчыка разгледжаны пытанні традыцыйнай сялянскай забудовы пасяленняў і двароў. Асноўная ўвага У.С Гурковым была ўдзелена асаблівасцям забудовы сялянскай сядзібы беларусаў у XIX – 60-я гг. XX ст. Гэта знайшло адлюстраванне ў яго дысертацыйным даследаванні і шэрагу публікацый [15-17].

Калектыўная манаграфія «Беларускае народнае жыллё» [18], якая была апублікавана ў 1973 г., змяшчае каштоўныя звесткі па традыцыйнай архітэктуры рэгіёна. У ёй разгледжаны традыцыйныя тыпы пасяленняў, планіроўка сядзіб, канструкцыйныя асаблівасці пабудоў, будаўнічыя матэрыялы, планіроўка жылля, інтэр’ер, гаспадарчыя пабудовы. У працы выяўлены лакальныя рысы народнай архітэктуры Беларусі, у тым ліку і на Падзвінні. Нягледзячы на абагульняючы характар гэтага выдання, у ім шырока прадстаўлены матэрыялы з Падзвіння.

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністаў БССР (09.12.1976) “Аб стварэнні Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту” яшчэ больш ажыўляецца даследаванне традыцыйнага народнага дойлідства. У ходзе працы па рэалізацыі пастановы былі ажыццёўлены шматлікія экспедыцыі ў рэгіёны Беларусі, зафіксаваны багаты матэрыял па праблеме. У выніку былі падрыхтаваны дзве манаграфіі “Помнікі народнай архітэктуры і быта Беларусі” (1979) [20] і “Помнікі этнаграфіі: Методыка выяўлення, апісання і збірання” (1981) [21].

Значны ўклад у даследаванне традыцыйнага народнага дойлідства Беларусі ў 1980-х – 2000-х гг. унеслі А.І. Лакотка, С.А. Сергачоў, У.В. Трацэўскі, А.М. Нароўская, В.С. Цітоў.

Праца В.С. Цітова «Гістарычна-этнаграфічнае раянаванне матэрыяльнай культуры беларусаў XIX – пачатку XX стст.» (1983) [22] прысвечана характарыстыцы матэрыяльнай культуры беларусаў, у тым ліку і народнага дойлідства, у сувязі з гістарычна-этнаграфічным раянаванні краіны. Ён ажыццявіў арэальнае даследаванне тыпаў забудоў. В.С. Цітоў ажыццявіў даследаванне планіроўкі і канструктыўных асаблівасцей жылля, яго лакальных адметнасцей. У адпаведнасці з лакальнай спецыфікай народнага дойлідства, як і іншых рысаў матэрыяльнай культуры, ён вылучыў шэсць гістарычна-этнаграфічных рэгёнаў Беларусі, у тым ліку і Паўночны (Падзвінне, Паазер’е). У іншай сваёй працы «Народныя дрэваапрацоўчыя промыслы Беларусі 1917-1941 гг.» (1976) [23] В.С. Цітоў разгледдзеў пытанні будаўніцтва беларускіх традыцыйных драўляных пабудоў.

Вялікую працу па вывучэнні традыцыйнай народнай архітэктуры Беларусі ажыццявіў А.І. Лакотка [24-51]. Яшчэ пачынаючы з 1980-х гг. А.І. Лакотка вывучае народную архітэктуру. Пачаў свае даследаванні з аналізу планіроўкі пасяленняў і сяліб. У наступным ён ахапіў увесь комплекс народнай архітэктуры Беларусі. У 1995 г. была надрукавана праца А.І. Лакоткі «Пад стрэхамі прашчураў» [46], дзе разгледжана сялянская сядзіба, прасочана яе эвалюцыя, вылучаны лакальныя рысы. У іншай працы «Беларусы. Т. 2. Дойлідства» (1997) [29] пытанні народнай архітэктуры разгледжаны даволі грунтоўна і шырока. Прааналізаваны сістэма рассялення (сельскія і гарадскія пасяленні), абаронча-замкавае дойлідства і жыллё. Нацыянальныя рысы беларускага дойлідства разгледжаны А.І. Лакоткам у манаграфіі «Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры» (1999) [43]. Асаблівую ўвагу навуковец удзяліў даследаванню народнага дойлідства на беларуска-рускім памежжы. Вынікі даследавання былі надрукаваны ў калектынай манаграфіі «Беларуска-рускае памежжа. Этналагічнае даследаванне» (2005) [24]. У 2008 г. якасці асобнай кнігі чацвёртага тома выдання “Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце” была апублікавана праца «Беларускае народнае дойлідства» [51], дзе падсумоўваліся даследаванні А.І. Лакоткі па адзначанай праблематыцы.

PolotskSU



С.А. Сергачоў даследуе народнае дойлідства Беларусі ў XVI – XIX ст. Першыя працы даследчыка былі апублікаваны яшчэ ў канцы 1970-х гг. Навукоўцам былі разгледжаны кампаненты сялянскай сядзібы, асноўныя тыпы забудовы двара, вызначаны іх арэалы, ахарактарызавана прасторавае асяроддзе і збудаванні, прыёмы іх кампазіцыйнага фарміравання. С.А. Сергачоў вызначыў канструкцыйныя асаблівасці народнага дойлідства (прасачыў іх эвалюцыю, распрацаваў класіфікацыю тыпаў злучэння канструкцый, вылучыў іх лакальныя рысы) [52-59].

У.В. Трацэўскі даследаваў планіроўку сельскага жылля ад старажытных часоў да 1970-х гг. Ён разгледзеў канструкцыйныя асаблівасці жылых пабудоў, вылучыў яго тыпы, прасачыў эвалюцыю [60]. З 1980-х гг. даследаваннем традыцыйнага інтэр'ера беларусаў займаецца А.М. Нароўская [61-66].

У сучасны перыяд пытанні народнага дойлідства Беларускага Падзіння таксама разглядаюцца С.А. Мілючэнкавым, Ю.Т. Шэстак, Г.І. Цяпковай. Беларускі этнолаг С.А. Мілючэнкаў разглядае традыцыйныя рысы драўляных гаспадарчых пабудоў, асаблівасці сялянскай і шляхецкай сядзібы [67–71]. Працы архітэктара Ю.Т. Шэстак прысвечаны такім кампанентам традыцыйнага жылля як дзверы і вокны [72-73]. Этнолагам Цяпковай Г.І. вызначаны ландшафтныя, планіровачныя, лакальныя асаблівасці дойлідства ў мястэчках Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XX ст. [74]. Сімвалічныя аспекты функцыянавання народнага дойлідства разгледжаны ў працах Я.Ю. Ленсу [75], У.А. Лобача [76].

**Вывады.** Такім чынам, даследаванне народнага дойлідства Беларускага Падзвіння мае даўнюю традыцыю. За працяглы перыяд з'явіўся шэраг прац, якія адрозніваюцца паміж сабой як паводле пытанняў, якія ў іх разглядаюцца, так і падыходамі адносна іх асвятлення.

Першая праца, што змяшчае матэрыялы па народнаму дойлідству Падзвіння, была апублікавана яшчэ ў канцы XVI ст. Сістэматычнае вывучэнне Падзвіння пачалося толькі ў XIX ст. Даследаванні першай паловы XIX ст. не вызначаліся сістэмнасцю. У гэты час вывучэнне краю адбывалася на аматарскім узроўні. Актывізацыя вывучэння краю адбываецца ў сярэдзіне XIX ст. Імпульсам гэтаму стала заснаваннем Рускага геаграфічнага таварыства. У гэты час былі апублікаваны даследаванні М. Анімеле, М.В. Без-Карніловіча, А.М. Семянтоўскага. Плённымі ў даследаванні народнага дойлідства беларусаў былі апошнія два дзесяцігоддзі XIX і пачатак XX ст. Вялікае значэнне ў вывучэнні краю маюць апублікаваныя ў гэты час працы П.В. Шэйна і М.Я. Нікіфароўскага. З'явіліся і абагульняючыя працы, дзе разгледжана і народнае дойлідства рэгіёна.

Важны этап у даследаванні рэгіёна пачаўся пасля Вялікай Айчыннай вайны. У 1950-1980-х гг. быў апублікаваны шэраг прац па розных аспектах традыцыйнага народнага дойлідства Беларусі, у якіх шырока прадстаўлены матэрыялы з Падзвіння. Пачынаючы з 1980-х гг. адбылася актывізацыя даследавання народнай архітэктуры Беларускага Падзвіння. З'явіўся шэраг даследчыкаў, якія займаліся вывучэннем гэтай часкі культуры рэгіёна (А.І. Лакотка, С.А. Сергачоў, У.В. Трацэўскі, А.М. Нароўская, В.С. Цітоў). У сучасны перыяд тэматыка даследаванняў народнай архітэктуры істотна пашыраюцца. .

ЛІТАРАТУРА

1. De Russorum religione, ritibus nuptiarum, funerum, victu, vestitu, &c. et de Tartarorum religione ac moribus: vera et luculenta Narratio. Ad D. Davidem Chytraeum recens scripta. – [Rostock] Excudebat Stephanus Myliander, 1582.
2. Падбярэскі, Р. Лісты пра Беларусь / Р. Падбярэскі // Шляхам гадоў : гіст.-літ. зб. / уклад. Я. Янушкевіч. – Мінск : Маст. літ., 1994. – С. 313 – 330.
3. Анимеле, Н. Быт белорусских крестьян / Н. Анимеле // Этнографический сборник. – 1854. – Вып. II. – С. 111–268.
4. Киркор, А. Этнографический взгляд на Виленскую губернию / А. Киркор // Этнографический сборник. – 1858. – Вып. III. – С. 1151–276.
5. Без-Корнилович, М.О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся / М.О. Без-Корнилович. – СПб. : Тип. III Отд. Собст. Е.И.В. Канцелярии, 1855. – 355 с.
6. Сементовский, А.М. Этнографический обзор Витебской губернии / А.М. Сементовский. – СПб. : Тип. М. Хана, 1872. – 69 с.
7. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края : в 3 т. / П.В. Шейн. – СПб. : Тип. Акад. наук, 1890 – 1902.
8. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности / Н.Я. Никифоровский. – Витебск : Губерн. тип., 1895. – VIII, 548, CLIV с.
9. Россия. Полное географическое описание нашего Отечества. – СПб., 1905. – Т. 9 : Верхнее Поднепровье и Белоруссия. – 620 с.
10. Аникиевич, К. Т. Сенненский уезд Могилевской губернии / К. Т. Аникиевич. – Могилев : Губернская тип., 1907. – 133 с.

PolotskSU



11. Харузин, А. Славянское жилище в Северо-Западном крае. Из материалов по истории развития славянских жилищ / А. Харузин. – Вильна : Типо-Литогр. Тов-ва и.ф. “Н. Маць и Ко”, 1907. – 458 с.
12. Каспяровіч, М. Асноўныя маманты беларускага дойлідства / М. Каспяровіч // Полымя. – 1927. – № 5.
13. Молчанова, Л. А. Из истории развития сельских поселений и усадеб белорусов / Л. А. Молчанова // Советская этнография. – 1956. – № 1. – С. 29–41.
14. Молчанова, Л. А. Материальная культура белорусов / Л. А. Молчанова. – Минск : Наука и техника, 1968. – 230 с.
15. Гуркоў, У. С. Да пытання аб развіцці сялянскіх сядзіб Віцебшчыны / У. С. Гуркоў // Пытанні беларускай этнаграфіі, фалькларыстыкі і тапанімікі. – Мінск, 1967.
16. Гурков, В. С. Развитие сельских поселений и усадеб Белоруссии (вторая половина XIX–XX вв.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.07 / В. С. Гурков ; АИ БССР, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора. – Минск, 1976. – 23 с.
17. Гурков, В. С. Современная белорусская деревня : Основные направления в развитии поселений и жилищ / В. С. Гурков. – Минск : Наука и техника, 1975. – 60 с.
18. Беларускае народнае жыллё / Э.Р. Сабаленка, У.С. Гуркоў, У.М. Іваноў, Дз.Д. Супрун ; рэд.: В.К. Бандарчык ; Акадэмія навук БССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1973. – 125 с.
19. Беларуская народная архітэктурная разьба / [Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР ; склад. Л. А. Малчанава ; пад рэд. М. Я. Грынблата ; маст. С. Ц. Гунько]. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1958. – 90 с.
20. Памятники народной архитектуры и быта Белоруссии : метод. пособие по выявлению и собиранию / под общей ред.: В. К. Бондарчика. – Минск, 1979. – 120 с.
21. Помнікі этнаграфіі: методыка выяўлення, апісання і збірання. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 149 с.
22. Титов, В.С. Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов: XIX – начало XX в. / В.С. Титов. – Минск : Наука и техника, 1983. – 152 с.
23. Титов, В.С. Народные деревообрабатывающие промыслы Белоруссии (1917–1941 гг.): Этнографич. очерки бондарского промысла и изготовления транспортных средств / В.С. Титов. – Минск : Наука и техника, 1976. – 135 с.
24. Белорусско-русское пограничье. Этнологическое исследование / отв. ред. Р.А. Григорьева, М.Ю. Мартынова. – М. : РУДН, 2005. – 390 с.
25. Локотко, А. И. Белорусское народное зодчество : середина XIX–XX в. / А. И. Локотко. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 286 с.
26. Локотко, А. И. Зодчество / А. И. Локотко // Нарысы гісторыі культуры Беларусі : у 4 т. / А. І. Лакотка [і інш.] ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2015. – Т. 3 : Культура сяла XIV – пачатку XX ст., Кн. 1 : Матэрыяльная культура. – С. 8–115.
27. Локотко, А. И. Историко-культурные ландшафты Беларуси / А. И. Локотко. – Минск : Белорусская наука, 2006. – 470 с.
28. Локотко, А. И. Историко-культурные регионы Беларуси / А. И. Локотко. – Минск : ЕГУ, 2002. – 228 с.
29. Беларусы : у 13 т. / рэдкал.: В. К. Бандарчык, М. Ф. Піліпенка, А. І. Лакотка. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – Т. 2 : Дойлідства. – 391 с.
30. Локотко, А. И. Общие и региональные особенности народного жилища Белоруссии (середина XIX – XX вв.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.07 / А. И. Локотко ; АН БССР, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора. – Минск, 1985. – 26 с.
31. Локотко, А. И. Поселения, постройки, архитектурные традиции / А. И. Локотко // Белорусы / отв. ред. В. К. Бондарчик [и др.]. – М., 1998. – Гл. 4. – С. 233–288.
32. Локотко, А. И. Типы традиционной застройки крестьянского двора в Белоруссии (XIX – середина XX в.) / А. И. Локотко // Советская этнография. – 1987. – № 4. – С. 114–127.
33. Локотко, А. И. Поселения, постройки, архитектурные традиции / А. И. Локотко // Белорусы / отв. ред.: В. К. Бондарчик [и др.]. – М., 1998. – Гл. 4. – С. 233–288.
34. Лакотка, А. І. А на тым гумнішчы… / А. І. Лакотка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1981. – № 4. – С. 41–43.
35. Лакотка, А. І. Беларусы. Дойлідства (Канцэпцыя гістарычнага феномена беларускай архітэктуры) : аўтарэф. дыс. … д-ра архіт. навук : 18.00.01 / А. І. Лакотка ; Беларус. дзярж. політэхн. акад. – Мінск, 2001. – 48 с.
36. Лакотка, А. І. Вянок на вільчыку / А. І. Лакотка // Беларуская мінуўшчына. – 1994. – № 4. – С. 24–27.
37. Лакотка, А. І. Вяночныя двары / А. І. Лакотка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1985. – № 3. – С. 32–33.

PolotskSU




38. Лакотка, А. І. Гісторыка-культурныя рэгіёны Беларусі / А. І. Лакотка // Роднае слова. – 2006. – № 1. – С. 5–8.
39. Лакотка, А. І. Дойлідства продкаў / А. І. Лакотка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1982. – № 4. – С. 22–24.
40. Лакотка, А. І. Малыя формы ў народным дойлідстве / А. І. Лакотка // Мастацтва Беларусі. – 1985. – № 1. – С. 71–72.
41. Лакотка, А. І. Мелодыі драўляных карункаў (агульныя рысы і рэгіянальныя асаблівасці беларускага народнага архітэктурнага дэкору) / А. І. Лакотка // Мастацтва Беларусі. – 1987. – № 7. – С. 68–72.
42. Лакотка, А. І. Народна-традыцыйная культура і задачы захавання дзяржавы ў кантэксце сучасных этнакультурных працэсаў / А. І. Лакотка // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – 2014. – №3. – С. 69–76.
43. Лакотка, А. І. Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры / А. І. Лакотка. – Мінск : Ураджай, 1999. – 364 с.
44. Лакотка, А. І. Паазер'е / А. І. Лакотка // Роднае слова. – 2006. – № 4. – С. 73–76.
45. Лакотка, А. І. Паграбы і стопкі / А. І. Лакотка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1984. – № 3. – С. 29–30.
46. Лакотка, А. І. Пад стрэхамі прашчураў / А. І. Лакотка. – Мінск : Полымя, 1995. – 384 с.
47. Лакотка, А. І. Скарбніца народнай архітэктуры / А. І. Лакотка // Полымя. – 1982. – № 4. – С. 167–172.
48. Лакотка, А. І. Сялянскія сядзібы Беларусі / А. І. Лакотка // Роднае слова. – 1998. – № 6. – С. 139–155.
49. Лакотка, А. І. У сялянскай хаце даўней і цяпер / А. І. Лакотка // Голас Радзімы. – 1985. – № 17. – С. 8.
50. Лакотка, А. І. Узоры на ліштвах / А. І. Лакотка // Літаратура і мастацтва. – 1980. – № 46. – С. 14–15.
51. Лакотка, А. І. Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце: у 4 т. / А. І. Лакотка. – Мінск: Беларус.навука, 2008. – Т.4, кн. 1: Беларускае народнае дойлідства. 495 с.
52. Сергачоў, С. А. Беларускае плотніцтва / С. А. Сергачоў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1977. – №3. – С. 26–30.
53. Сергачев, С. А. Деревянная архитектура Белоруссии XVI – XIX вв. / С. А. Сергачев. – Минск : Полымя, 1984. – 78 с.
54. Сергачев, С. А. Белорусское народное зодчество / С. А. Сергачев // Минск : Ураджай, 1992. – 255 с.
55. Сергачев, С. А. Потенциал взаимодействия и взаимосвязанности народного зодчества / С. А. Сергачев // Архитектура и строительство. – 2008. – №4. – С. 26–29.
56. Сергачев, С. А. Народное зодчество Беларуси : региональные особенности / С. А. Сергачев // Техническое нормирование, стандартизация и сертификация в строительстве. – 2009. – № 2. – С. 144–158.
57. Сергачев, С. А. Народное зодчество Беларуси : опыт теплозащиты зданий / С. А. Сергачев // Архитектура и строительство. – 2008. – № 1. – С. 30–33.
58. Сергачев, С. А. «А гэтая хата вось якая» / С. А. Сергачев // Техническое нормирование, стандартизация и сертификация в строительстве. – № 1. – 2011. – С. 105–109.
59. Сергачев, С. А. «З камаровы нос сякерку…» / С. А. Сергачев // Техническое нормирование, стандартизация и сертификация в строительстве. – 2010. – № 6. – С. 103–106.
60. Трацевский, В. В. Народное зодчество Белоруссии / В. В. Трацевский. – Минск : Полымя, 1976. – 32 с.
61. Нароўская, А. М. Змены ва ўнутранай планіроўцы сялянскага жылля (XIX – пачатак XX ст.) / А. М. Нароўская // Быт і культура беларусаў : тэзісы дакладаў навук. канф. «Быт і культура беларусаў», Мінск, красавік 1984 г. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: В. К. Бандарчык, А. С. Фядосік. – Мінск, 1984. – С. 29–31.
62. Нароўская, А. М. Прылады асвятлення (канец XIX – пачатак XX ст.) / А. М. Нароўская // Быт і культура беларусаў : тэзісы дакладаў навук. канф. «Быт і культура беларусаў», Мінск, красавік 1984 г. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: В. К. Бандарчык, А. С. Фядосік. – Мінск, 1984. – С. 33–34.
63. Наровская, А. Н. Общие и локальные особенности интерьера белорусского народного жилища (конец XIX – начало XX вв.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.07 / А. Н. Наровская ; АН БССР, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора. – Минск, 1989. – 21 с.
64. Нароўская, А. М. Сімвалічнае значэнне дзвярэй і акон традыцыйнага жылля Віцебскай губерні / А. М. Нароўская // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею : матэрыялы навук. канф., Віцебск, 30 – 31 кастрычніка 2008 г. / Установа культуры «Віцебскі абласны краязнаўчы музей» ; рэдкал.: Г. У. Савіцкі, В. А. Шышанаў, А. І. Лагунова. – Мінск, 2009. – С. 82–85.
65. Нароўская, А. М. Жыллё ў звычаях і абрадах беларусаў (канец XIX – пачатак XX стст.) / А. М. Нароўская. – Мінск : РІВШ, 2008. – 36 с.

PolotskSU



66. Нароўская, А. М. Інтэр'ер традыцыйнага народнага жылля / А. М. Нароўская // Нарысы гісторыі культуры Беларусі : у 4 т. / А. І. Лакотка [і інш.] ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2015. – Т. 3. Культура сяла XIV – пачатку XX ст. Кн. 1. Матэрыяльная культура. – С. 116–195.
67. Милюченков, С. А. Традиции в организации хозяйственно-бытовой среды сельского населения Беларуси / С. А. Милюченков // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы» ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2008. – Вып. 4. – С. 372–377.
68. Милюченков, С. А. Традиционные сельскохозяйственные постройки в этнокультурном пространстве Беларуси и соседнего зарубежья / С. А. Милюченков // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы» ; навук. рэд. А. І. Лакотка. –Мінск, 2011. – Вып. 10. – С. 396–403.
69. Милюченков, С.А. Традиционные постройки в народной терминологии Белоруссии и соседнего зарубежья / С.А. Милюченков // Границы, культуры и идентичности. Этнология восточнославянского пограничья / Редактор-составитель М.Ю. Мартынова. – Москва: ИЭА РАН, 2012. – С. 182 – 236.
70. Милюченков, С.А. Основные исторические типы надворных построек и их культурная идентификация в деловой письменности XVI – XVIII вв. Великого княжества Литовского / С.А. Милюченков // PALAEOSLAVICA. International Journal for the Study of Slavic Medieval Literature, History, Language and Ethnology. – Cambridge, USA, 2013. – V. XXI, no. 2, pp. 69 – 93.
71. Мілючэнкаў, С.А. Магнацкія і шляхецкія маёнткі / С.А. Мілючэнкаў // Нарысы гісторыі культуры Беларусі. У 4-х т. Т. 1. Культура сацыяльнай эліты XIV – пач. XX ст. / навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск: Бел. Навука, 2013. – С. 43 – 65.
72. Шэстак, Ю. Т. Характэрныя асаблівасці ваконнага і дзвярнога аздаблення ў народным дойлідстве Беларускага Падзвіння (па матэрыялах палявых даследаванняў «Студэнцкага этнаграфічнага таварыства») / Ю. Т. Шастак // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў (да 20-годдзя археалагічных і этнаграфічных экспедыцый ПДУ) : зб. навук. артыкулаў II міжнар. навук. канф. (да 20-годдзя археалагічных і этнаграфічных экспедыцый ПДУ), Полацк, 17–18 красавіка 2014 г. : у 2 ч. / пад агульнай рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача, С. А. Шыдлоўскага. – Наваполацк, 2014. – Ч. 1. – С. 268–274.
73. Шастак, Ю. Т. Рэгіянальныя рысы традыцыйнай архітэктуры жылля на Падзвінні (па выніках палявых даследаванняў «Студэнцкага этнаграфічнага таварыства») / Ю. Т. Шастак // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку) : зб. навук. прац рэсп. навук.-практ. семінара, Полацк, 20–21 лістапада 2008 г. / пад агульнай рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача. – Наваполацк, 2009. – С. 272–278.
74. Тяпкова, А. И. Местечки Беларуси. Этнологическое исследование / А. И. Тяпкова. – Минск : Беларуская навука, 2018. – 189 с.
75. Ленсу, Я. Ю. Касмалагічная сімволіка беларускага народнага жытла / Я. Ю. Ленсу // Актуальныя праблемы мастацтва : гісторыя, тэорыя, методыка : матэрыялы II Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 7–8 красавіка 2011 г. / Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка ; рэдкал.: В. І. Жук, М. Р. Баразна, У. А. Васілевіч ; адк. рэд. Ю. Ю. Захарына. – Мінск, 2011. – С. 62–64.
76. Лобач, У.А. Міф. Прастора. Чалавек: беларускі традыцыйны ландшафт у семіятычнай перспектыве / У.А. Лобач. – Мінск : Тэхналогія, 2013. – 511 с.

## THE HISTORY OF THE STUDY OF THE BYELORUSSIAN PADZVINNE NATIONAL ARCHITECTURE

*U. AUSEICHYK*

*The history of studying the folk architecture of the Belarusian Padzvinne is considered. The stages in the study of this problem are highlighted, the works are characterized, the significance of research and their contribution to the study of the traditional folk architecture of the region is revealed. The article analyzes the works published in the period from the XVI century to our time. Despite the fact that the first study appeared at the end of the XVI century, but a systematic study of the folk architecture of the region began only in the XIX century. Therefore, the main focus of the work is on the studies of the 19th and early 21st centuries.*

***Keywords:*** *historiography, architecture, Belorussian Padzvinne, traditional culture, Belarusian ethnos.*